# ДУХОЎНА-МАРАЛЬНЫЯ АСНОВЫ АБНАЎЛЕННЯ ГРАМАДСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

П.Р.Ігнатовіч

Актуальнасць названай праблемы вызначаецца перш за ўсе той ярка выражанай запатрабавальнасцю ў свядомасці, у рэфлексіі, якая існуе сення ў грамадстве. Пытанне ў тым, хто мы такія, куды ідзем, што нас чакае ў будучым, якая мэта сацыяльнага развіцця, што патрэбна зрабіць для таго, каб узнавіць духоўны патэнцыял, не належаць да ліку абстрактных. Яны хвалююць самыя шырокія слаі насельніцтва, і перш за ўсе моладзь, якая па волі лесу апынулася на рубяжы двух гістарычных эпох.

Адказы на гэтыя карэнныя пытанні, даваемыя публіцыстамі, пісьменнікамі, грамадскімі дзеячамі розных палітычных накірункаў у многім не здавальняюць растрывожаную грамадскую свядомасць, бо яны не пазбаўлены налета тэндэнцыйнасці, суб'ектывізма, неаб'ектыўнасці. Чым далей разгортваюцца ў грамадстве сучасныя працэсы, тым больш відавочнай становіцца неабходнасць навуковага асэнсавання даных праблем, у тым ліку і ў сацыялагічным плане. Бо меры, здзяйсняемыя на аснове недакладнай, а тым больш падманнай інфармацыі з непазбежнасцю прыводзяць да рэзультатаў адваротных тым, на якія былі разлічаны. З гэтага вынікае: для таго, каб дабіцца карэннага пералома ў духоўным асяродзі, неабходна ведаць рэальнае становішча духойнасці, культуры, на якія духойныя каштоўнасці і нормы арыентуюцца тыя ці іншыя сацыяльныя групы.

Культура наогул і духоўная ў прыватнасці адыгрывае асаблівую ролю ў жыцці грамадства. Яна выступае спецыфічным сродкам пазнання, з'яўляецца унікальным сацыяльным механізмам. Дзякуючы якому адбываецца працэс наследвання, перадачы матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, сацыяльнага вопыта аднаго пакалення другому, дасягаецца грамадская згода паміж бакамі, якія прытрымліваюцца розных пунктаў гледжання.

Наша сённяшняе жыццё па вобразнаму выказванню В.Кабіча апынулася на краю духоўнай катастрофы. Сення для многіх амаралізм стаў правілам, жульніцтва і абман – прывычкай, цынізм –

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

вартасцю. Даступнасць легкага ўзбагачэння растляваюць маладых людзей, адвучаюць іх ад працы, параджаюць атмасферу ўседазволенасці, падзенне нораваў, беззаконня. Наколькі гэта небяспечна можна меркаваць па выказванню Ф.Дастаеўскага, які адзначаў, што няма для чалавека больш страшнага ворага, чым анархія ў сферы маралі і ўседазволенасць.

Не прэтэндуючы на вычарпальную паўнату, зраблю спробу назваць некаторыя духоўна-маральныя аспекты абнаўлення грамадства.

З мэтай сур'езных вывадаў на будучыню, для фарміравання новага грамадскага мыслення нам патрэбна як мага больш дэталёва вывучаць наша мінулае, трэба пазнаць яго ва ўсіх супярэчнасцях, выкарыстоўваць нашу гісторыю на патрэбу будучыні.

На жаль пакуль што на Беларусі ёсць людзі, у тым ліку і сярод палітыкаў, якія прызываюць да поўнага адмаўлення мінулага і будаўніцтва "светлага будучага" з чыстага ліста.

Міжнародны вопыт, ды і наш таксама гавораць, што так не бывае.

Павага да мінулага - важнейшы элемент нацыянальнай самапавагі, самасвядомасці. Мы ніколі не створым дзяржаўнасці, калі пачнем выкрэсліваць з гісторыі няўгодныя камусьці імены, ці аб'яўляць памылкай жыцце цэлых пакаленняў. Можна варварскі разрушыць колькі ўгодна помнікаў тым ці іншым дзеячам, але гісторыя ад гэтага не зменіцца. Якая б яна ні была наша гісторыя, гераічная, ці трагічная, але яна наша. І яе патрэбна успрымаць з павагай.

Вельмі важнай з'яўляецца праблема адносін грамадства і дзяржавы да інтэлігенцыі. Здаецца быццам спецыяльна ствараюцца умовы ў якіх нельга стваральна працаваць дзеячам навукі, культуры. Як рэзультат найбольш кваліфікаваныя спецыялісты, маладыя вучоныя уходзяць у камерцыйныя структуры, ад'язджаюць за рубеж. І увозяць з сабой рэзультаты навуковых даследванняў.

Устае пытанне чыей жа маемасцю з'яўляюцца рэзультаты навуковага даследвання, атрыманыя цэлымі калектывамі - сучасныя тэхналогіі у адзіночку не ствараюцца.

Не пераламіўшы такой тэндэнцыі грамадства доўга будзе адчуваць на сабе іх вынікі.

Захаваць інтэлігентнасць і інтэлігенцыю. Пераарыентаваць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перарабіць тое становішча калі інтэлігент - духоўны асветнік народа - становіцца поўнасцю залежным ад спонсараў. Чужыя вобразы, манеры, словы, думкі, чужыя стандарты патокам хлынулі к нам, папіраюць ісконныя пачуцці нашага народа, атручваюць мараль.

Важнейшае пытанне - фарміраванне ідэалаў. Наша грамадства, асабліва моладзь аказаліся без ідэалаў, без будучыні. Адны з іх мы паспяхова разрушылі, знішчылі, а другіх не стварылі.

Пры усіх складанасцях, якія суправаджаюць наша жыцце у якасці ідэалаў павінна быць свабода, дабрачыннасць, дабрадзейнасць, самакошт асобы.

У гэтым вельмі важным пытанні добрую справу можа саслужыць наш зварот да хрысціянскай традыцыі, якая прадстаўляе сабой значны пласт духоўнай культуры, у рамках якой чалавецтва здзейсніла гіганцкі шлях да самапазнання і вяршынь духоўнасці. Але ж і тут павінна быць пачуцце меры і асаблівай шчырасці, чыстасардэчнасці. Бо калі гэта робіцца без шчырасці, заўседы відна фальш. На гэтай базе павінны складвацца і суадносіны паміж рэлігійным і свецкім светапоглядам.

Важнейшай праблемай з'яўляецца пазбаўленне ад утапізма. Утопія заўседы існавала як падробнае паслядоўнае апісанне увасабляемага грамадства, пабудаванага на аснове альтэрнатыўнай сацыяльна-гістарычнай гіпотэзы і арганізаванага больш дасканала, чым грамадства у якім жыве аўтар.

Заходні свет сумеў даволі паспяхова выцесніць утапічны светапогляд з усімі яго атрыбутамі на перыферыю сацыяльнай думкі, захоўваючы яго у якасці то сродка сацыяльнай крытыкі, то прадмета чыста эмацыянальнага характару. Гэтаму у многім садзейнічалі урокі айчыннага гістарычнага эксперымента.

Сучаснай утопіяй з'яўляецца сенняшняя прадстаўленне многіх людзей быццам наша грамадства зможа выйсці з крызіса з дапамогай, якая павінна прыйсці ці то з Захаду, ці то з Усходу. Беларусь паставяць на ногі, прымусяць гаварыць з ей з павагай напружаная праца і прыродны талент нашага народа. На жаль апошнія гады былі азнаменаваны разрушальнымі працэсамі. Пагэтаму фарміраванне стваральнай свядомасці вельмі важны фактар.

Сур'езны фон уяўляе тая палітычная палітра, якая складва-

ецца у рэспубліцы у сувязі з узнікненнем вялікай колькасці палітычных партый і рухау. Толькі наяунасць добрай волі усіх палітычных сіл можа стварыць спрыяльныя умовы для поспеху рэформ.

## ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СВЯДОМАСЦІ МОЛАДЗІ У ПЕРЫЯД АДРАДЖЭННЯ ДЗЯРЖАВЫ

К.Шленчка, прафесар Шленскага універсітэта

Звяртаючыся да агульнай тэмы нашай канферэнцыі, я б хацеу прадставіць (у вельмі сціслай і не зусім сур'езнай форме) некаторыя вынікі апошніх нашых польскіх, так бы мовіць, "прыгод" у той галіне, што тычыцца цяжкасцей у выкарыстанні вельмі папулярнай і шырока распаусюджанай схемы суадносін паміж агульначалавечымі і нацыянальнымі каштоунасцямі у культуры і мастацтве, і (што для мяне прафесійна вельмі важна) у галіне выхавання.

Пасля падзення камунізму у Польшчы, які у афіцыйных тэорыях выхавання і культуры дыктавау даволі аднародную, амаль пазбауленую сур'езных нацыянальных акцэнтау, вельмі абстрактную сістэму духоуных каштоунасцей, мы у галіне школьнага выхавання апынуліся у так званай "аксіалагічнай пустаце". І на гэтае пустое поле адразу ж трапілі дасюль афіцыйна ігнараваныя, але на шчасце існуючыя у глыбінях народнага вопыту багатыя і даунія нацыянальныя традыцыі. Але, захоуваючыся галоуным чынам у сям'і (часцей за усе каталіцкай) і у каталіцкім касцеле, яны далі свае парасткі у вельмі аднабаковай, скарочанай форме. Адсюль папулярны, але не зусім слушны тэзіс-лозунг: "паляк - гэта католік". Ен недакладны не толькі таму, што у польскую культуру, дарэчы, былі зроблены вельмі каштоуныя "некаталіцкія" уклады, але яшчэ і з той нагоды, што католік у Польшчы можа азначаць (і азначае) вельмі розныя падыходы да жыцця. Нас яшчэ чакае поунае узнауленне нашай культурнай спадчыны, у чым не надта зацікаулены некаторыя так званыя хрысціянскія нацыяналісты, якія увесь час стрымлівалі уплыу на Польшчу культуры Захаду.

Зразумела, што у скарбонках як прыхільнікау ідэі агульна-